**Урок па вучэбным прадмеце “Чалавек і свет”**
**па тэме “Вадаём і яго насельнікі” (3 клас)**

**Наталля Уладзіміраўна Хмялеўская,**
настаўнік пачатковых класаў
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Махнавіцкай сярэдняй школы Мазырскага раёна

**Урок накіраваны на фарміраванне ўяўленняў пра вадаём як прыроднае згуртаванне, вывучэнне разнастайнасці яго насельнікаў і іх прыстасавання да воднага асяроддзя, а таксама на выхаванне беражлівых адносін да водных рэсурсаў і пачуцця захаплення прыродай сваёй краіны.**

**Мэта:** знаёмства вучняў з прыродным згуртаваннем “вадаём”, яго насельнікамі.

**Задачы:**

фарміраваць уяўленні пра разнастайнасць раслін і жывёл, якія насяляюць рэкі і азёры Беларусі, асаблівасцях іх знешняга выгляду, пра ўзаемасувязі паміж насельнікамі прыроднага згуртавання “вадаём”;

развіваць назіральнасць, уменне вызначаць асаблівасці прыстасавання раслін і жывёл вадаёмаў да ўмоў жыцця;

выхоўваць пачуццё захаплення прыродай сваёй краіны.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік “Чалавек і свет” (Г.У. Трафімава, С.А. Трафімаў, 2025); мульціборд; карткі з заданнямі; карцінкі з адлюстраваннем насельнікаў прыроднага згуртавання “вадаём”.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны этап

**Настаўнік:** Я перадаю вам свой добры настрой з дапамогай усмешкі – усміхнёмся адзін аднаму; я перадаю вам сваю дружбу праз поціск рук – паціснем рукі; я хачу разам з вамі зняць трывогу – давайце глыбока ўздыхнём і павольна выдыхнем; я хачу падарыць вам упэўненасць у сабе – вялікі палец правай рукі ўверх. Я ўпэўнена, што ўсё ў нас атрымаецца.

### II. Этап актуалізацыі суб’ектнага вопыту навучэнцаў

– Што такое прыроднае згуртаванне? Назавіце прыродныя згуртаванні Беларусі.

– Назавіце прыроднае згуртаванне, у якім пераважаюць дрэвы. *(Лес.)*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

– Назавіце самыя распаўсюджаныя дрэвы нашых лясоў. *(Сасна, елка, бяроза, дуб.)*

***Заданне "Складзі схему".***

– Кожны лес прыгожы і непаўторны ў любую пару года. Лес – краса нашай зямлі і яе нацыянальнае багацце. Лес мае вельмі вялікае значэнне для жывой і нежывой прыроды. Дапоўніце схему, карыстаючыся словамі-падказкамі.

ЛЕС
→ ачышчае … *(паветра, узбагачае яго кіслародам)*;
→ засцерагае … *(глебу ад разбурэння вадой і ветрам)*;
→ прыродны дом … *(для раслін, грыбоў і жывёл)*;
→ захоўвае … *(запасы вады, якія жывяць рэкі і азёры)*;
→ уплывае … *(на жыццё іншых прыродных згуртаванняў)*.

***Выступленні вучняў.***

**1-ы вучань.** *Значэнне леса для нашых продкаў.*

Нашы продкі з дрэў узводзілі крэпасці, храмы, дамы. У драўляных калысках калыхалі дзяцей. З дрэва рабілі мэблю, посуд, цацкі, абутак (лапці). А зямлю апрацоўвалі драўлянай сахой.

**2-і вучань.** *Значэнне леса для чалавека.*

Драўніна выкарыстоўваецца для вырабу мэблі, музычных інструментаў, паперы, тканін. З кары хвойных дрэў атрымліваюць фарбы. З ігліцы вырабляюць вітамінныя дабаўкі да корму свойскай жывёлы. У лясах людзі нарыхтоўваюць грыбы, ягады, арэхі і лекавыя травы.

**3-і вучань.** *Клопат людзей пра лясы.*

У нашай краіне работнікі лясной гаспадаркі ахоўваюць лес ад насякомых-шкоднікаў, лечаць або ссякаюць хворыя дрэвы. З насення вырошчваюць маладыя дрэўцы і высаджваюць іх на высечках. Людзі клапоцяцца пра жывёл: агароджваюць мурашнікі, зімой падкормліваюць звяроў, вясной у лесе развешваюць штучныя гняздоўі для птушак.

– Як вы можаце дапамагчы захаваць лес? *(Адказы вучняў.)*

***Заданне "Злучы экалагічны знак з правілам".***

Вучні атрымоўваюць частку карткі, на якой напісана правіла беражлівых адносін да прыроды. Неабходна знайсці другую частку карткі, на якой адлюстраваны экалагічны знак, што адпавядае правілу і растлумачыць, чаму так рабіць нельга.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| Картка | Экалагічны знак | Тлумачэнне правіла |
|---|---|---|
| Не ламайце галінкі дрэў і кустоў. |  | Дрэва можа захварэць і загінуць. |
| Не рвіце кветкі. |  | Застануцца без нектару матылі, пчолы і чмялі, знікне прыгажосць прыроды. |
| Збіраючы грыбы, старайцеся не пашкодзіць грыбніцу. |  | Грыбніца – цела грыба, на ёй вырастаюць новыя грыбы. |
| Не шуміце, каб не палохаць жывёл і птушак. |  | Напалоханая птушка пабаіцца падляцець да гнязда, і птушаняты застануцца галоднымі. |
| Не разбурайце гнёзды, не бярыце дарослых птушак і птушанят дадому. |  | Калі птушка ўбачыць, што хтосьці чапае яе гняздо і яйкі, яна больш не вернецца да гэтага месца, бо палічыць яго небяспечным і знойдзе сабе больш зацішнае мястэчка для пабудовы новага гнязда. |
| Не пакідайце ў лесе смецце: бітае шкло, кансервавыя бляшанкі, паперу. |  | Асколак шкла можа стаць прычынай пажару падчас гарачага надвор'я. |
| Не распальвайце ў лесе кастры без дарослых. Беражыце лес ад пажараў. |  | На ўчастку лесу, які выгараў, жыццё адновіцца толькі праз 50-60 гадоў! |
| Нельга самавольна высякаць дрэвы. Збірайце макулатуру. |  | Макулатуру выкарыстоўваюць для вырабу паперы і кардону. 60 кг макулатуры зберагаюць ад вырубкі адно дрэва. |

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**III. Этап засваення новых ведаў і спосабаў дзеянняў**

– Сёння мы пазнаёмімся яшчэ з адным прыродным згуртаваннем і яго насельнікамі. З якім, вы даведаецеся адгадаўшы рэбусы.




(Рака.)







(Возера.) (Ручай.)

– Рака, возера, ручай. Як можна назваць іх адным словам? *(Вадаём.)*

– Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з прыродным згуртаваннем “вадаём”, даведаемся, якія расліны і жывёлы насяляюць рэкі і азёры Беларусі.

– Што такое вадаём? Прачытайце азначэнне і пастарайцеся яго запомніць. *(Вадаём – вялікае паглыбленне на паверхні зямлі, запоўненае вадой.)*




– Рэкі, азёры, ручаі, вадасховішчы, сажалкі – гэта вадаёмы. Рэкі і азёры Беларусі – прыродны дом для многіх раслін і жывёл. Тут яны знаходзяць усё неабходнае для жыцця: святло, цяпло, паветра, ваду, ежу.

Перад вамі водная прастора *(на дошцы – імітацыя вадаёма)*, якая яшчэ не з’яўляецца прыродным згуртаванннем. Як вы лічыце чаму? *(Там ніхто не жыве.)*

– Каб ператварыць гэту водную прастору ў вадаём, нам патрэбна засяліць яе.

Апынуўшыся ля вадаёма ў цёплы час года, вы маглі назіраць толькі тых насельнікаў, якія жывуць на паверхні. А жыццё ў вадаёме ёсць усюды: каля берагоў, на паверхні і ў тоўшчы вады, на дне. *(Настаўнік прымацоўвае на дошцы таблічкі з запісамі.)*

**Работа з вучэбным дапаможнікам.**

– Успомніце, якія расліны вы бачылі ў рэках і азёрах. *(Адказы вучняў.)*

– Звернемся да падручніка. Якія расліны вадаёма вы бачыце на малюнку? *(Трыснёг, рагоз, стрэлкаліст, раска, гарлачык жоўты.)*

– Знайдзіце ў тэксце на с. 47 інфармацыю пра іх і прачытайце.

– Якія расліны растуць каля берагоў вадаёмаў? На паверхні вады? У тоўшчы вады? Што вы даведаліся пра іх?

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

***Хвілінка цікавага***

– А ці ведаеце вы, якая самая вялікая кветка ў дзікай прыродзе? Дзе яна расце? Гэта – гарлачык белы.

Сапраўдным жывым барометрам з’яўляецца гарлачык белы. К канцу дня кветкі сціскаюцца ў бутон і хаваюцца пад вадой. Калі на паверхні вадаёма, дзе расце гарлачык белы, раніцай не з’яўяцца кветкі, чакаецца дождж.

– Размясціце на ўяўным вадаёме расліны, у залежнасці ад месца іх пражывання.

***Заданне “Правер сябе”***

– Суаднясіце карцінкі, на якіх адлюстраваны расліны вадаёма з іх назвамі.

рагоз



стрэлкаліст



трыснёг



раска



**Фізкультхвілінка**

**Работа з вучэбным дапаможнікам.**

– Прывядзіце свае прыклады насельнікаў вадаёмаў. *(Адказы вучняў.)*

– Назавіце жывёл, адлюстраваных на малюнку ў падручніку.

– Якія з жывёл жывуць на паверхні вады. *(Клапы-вадамеркі, жукі-вертуны.)* Як насельнікі вадаёмаў прыстасаваліся да ўмоў жыцця? Знайдзіце на с. 48-49 інфармацыю пра іх і зачытайце.

– Якія з жывёл жывуць у тоўшчы вады і на дне вадаёма? *(Малюскі катушкі, жукі-плывунцы, вадзяныя вослікі, рачныя ракі.)* Знайдзіце на с. 50 інфармацыю пра іх і зачытайце.

– Аб якой жывёле вадаёма вы пачулі ўпершыню?

– Якая жывёла вас здзівіла?

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

– У прыбярэжных зарасніках гняздуюцца дзікія качкі, гусі, лебедзі. Гэтыя вадаплаўныя птушкі харчуюцца раслінамі, насякомымі, смаўжамі.

***Хвілінка цікавага***

Лебедзі плаваюць пры дапамозе перапончатых лап, а для таго каб узляцець, разбягаюцца па паверхні вады.

Харчуюцца лебедзі водарасцямі, дробнымі карэньчыкамі, чарвякамі, маленькімі рыбкамі. Яны апускаюць у ваду свае доўгія шыі і старанна даследуюць дно ў пошуках спажывы.

У лебедзяў вельмі моцныя сем’і. Яны ствараюць пару адзін раз і на ўсё жыццё. Самка ў гняздзе адкладвае яйкі, а самец увесь час знаходзіцца побач і ахоўвае сваю сям’ю.

*Настаўнік прымацоўвае на дошку карцінкі з адлюстраваннем бабра, андатры, выдры.*

– Разгледзьце жывёл на малюнках. Якія з жывёл вам вядомы? *(Адказы вучняў.)*

– На берагах рэк і азёр селяцца бабры, андатры, выдры. Яны добра плаваюць і ныраюць. Паміж пальцамі задніх ног у іх – плавальныя перапонкі. Доўгі хвост служыць рулём падчас плавання.

*Прагляд відэафрагмента ўрока “Вадаём і яго насельнікі” https://eior.by/catalog_lecture/3-klass/chelmir/6-1.php*

– Размясціце на ўяўным вадаёме жывёл, у залежнасці ад месца іх пражывання.

***Заданне “Правер сябе”***

Суаднясіце пачатак сказа з яго канчаткам.

| | |
|---|---|
| Выдры | жывуць у норах, уваход у жыллё размяшчаецца пад вадой, харчуюцца раслінамі, малюскамі, ракамі, дробнай рыбай. |
| Бабры | робяць гнёзды ў зараслях ля вады, палююць на рыб, жаб, ракаў, вадаплаўных птушак. |
| Андатры | жывуць у хатках, уваход у жыллё размяшчаецца пад вадой, харчуюцца раслінамі. |

***Заданне “Пазнай жывёлу вадаёма па апісанні”***

– Выкарыстоўваючы карцінкі на дошцы, паспрабуйце даведацца пра каго з насельнікаў вадаёма ідзе гутарка.

- Гэтыя драпежныя клапы бегаюць па паверхні вады. Іх доўгія ножкі пакрыты валаскамі, змазанымі тлушчам, таму яны не тонуць. *(Вадамеркі.)*
- Гэтыя жукі кружацца на паверхні ў пошуках чарвякоў і насякомых. *(Жукі-вертуны.)*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

o Яны палююць на насякомых, малькоў, апалонікаў. Адначасова ўзмахваючы заднімі нагамі, хутка рухаюцца ў вадзе. *(Жукі-плывунцы.)*

o Жывуць на дне ў чыстых рачных водах. *(Ракі.)*

o Яны з'яўляюцца санітарамі, чысцяць ваду, жывячыся рэшткамі раслін і жывёл. *(Вадзяныя вослікі.)*

o Гэта драпежная жывёла палюе на рыб, жаб, ракаў, вадаплаўных птушак. *(Выдра.)*

o Гэта жывёла харчуецца раслінамі, таму селіцца на берагах рэк і азёр, дзе растуць дрэвы і кусты лісцевых парод. *(Бабёр.)*

o Гэта жывёла харчуецца раслінамі, але калі раслінных кармоў недастаткова, яна можа харчавацца малюскамі, дробнай рыбай. *(Андатра.)*

**IV. Этап замацавання новых ведаў і спосабаў дзеянняў.**

***Заданне "Засялі расліны і жывёлы"***

– Прымацуйце карткі з адлюстраваннем жывёлы або расліны адпаведна месца іх пражывання:

- каля берагоў *(трыснёг, рагоз, стрэлкаліст, дзікія качкі, бабры, андатры, выдры);*
- на паверхні вады (*гарлачык жоўты, гарлачык белы, раска, клапы – вадамеркі, жукі-вертуны);*
- у тоўшчы вады *(водарасці, малюскі катушкі, жукі-плывунцы);*
- на дне вадаёма *(рачныя ракі, маленькія рачкі – вадзяныя вослікі).*

**V. Этап абагульнення і сістэматызацыі ведаў.**

***Гульня "Закончы сказ"***

– Я буду пачынаць сказ, а прадаўжаць яго будзе той, каму я кіну мяч.

1) Рэкі, азёры, ручаі, вадасховішчы, сажалкі – гэта … *(вадаёмы).*
2) Рэкі і азёры Беларусі – прыродны дом для … *(многіх раслін і жывёл).*
3) У вадаёмах расліны і жывёлы знаходзяць усё неабходнае для жыцця: … *(святло, цяпло, паветра, ваду, ежу).*
4) Вадаём – гэта прыроднае згуртаванне, у якім … *(расліны і жывёлы прыстасаваліся да водных умоў жыцця).*
5) Жыццё ў вадаёмах ёсць каля … *(берагоў, на паверхні і ў тоўшчы вады, на дне).*

– Чаму вадаём – гэта прыроднае згуртаванне?

*Параўнанне адказаў з тэкстам вучэбнага дапаможніка.*

**VI. Этап падвядзення вынікаў урока.**

– Якой была тэма сённяшняга ўрока? Што новага вы даведаліся?

– З якімі раслінамі і жывёламі вадаёмаў вы пазнаёміліся?

– Як жывёлы вадаёма звязаны адна з адной і з раслінамі?

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

– Які вывад можна зрабіць па тэме нашага ўрока? *(Расліны і жывёлы ў вадаёме жывуць у цеснай сувязі паміж сабой. Таму вадаём – гэта прыроднае згуртаванне.)*

**VII. Этап інфармавання пра дамашняе заданне.**

Прачытаць тэкст на с. 47-51, адказаць на пытанні с. 51. Карыстаючыся энцыклапедычнымі выданнямі, інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтаваць паведамленне пра насельнікаў вадаёмаў.

**VIII. Рэфлексія.**

– Прадоўжыце сказ:

- На ўроку я даведаўся што …
- Мне было цікава …
- Мне было цяжка …
- Мне захацелася …
- У мяне атрымалася …

**Літаратура**


1. Знаки бережного отношения к природе [Электронный ресурс]. – Режим доступа:https://celes.club/collections/277-znaki-berezhnogo-otnoshenija-k-prirode.html – Дата доступа: 22.09.2025.
2. Лебедь (описание для детей) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://dokladiki.ru/doklad/lebed-opisanie-dlya-detey – Дата доступа: 10.09.2025.
3. Трафімава, Г. У. Чалавек і свет. Падручнік для 3 класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання 2-е выданне, папраўленае і дапоўненае / Г. У. Трафімава, С. А. Трафімаў. – Мінск : Акадэмія адукацыі, 2025. – 144 с.


NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА